Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

№ 27 (458) | Серада, 4 кастрычніка 1961 г. | Цана 1 кап.

## САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

*Мы, выпускнікі Беларускага Дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна, сардэчна віншуем усіх вучоных, узнагароджаных ордэнамі і медалямі за заслугі ў падрыхтоўцы спецыялістаў і развіцці навукі. Жадаем Вам, дарагія нашы выхаваццелі, выдатнага здароўя і вялікіх поспехаў у далейшай рабоце на карысць сацыялістычнай краіны.*

*Ларыса ВАРАНЕНКА, Барыс ГАДУНОЎ, Іна КАМНЕВА, Ганна ПЯТРОВІЧ, Віктар ЦІТЭНКА, настаўнікі Блужскай сярэдняй школы Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.*



НА ЗДЫМКУ: група вучоных БДУ, узнагароджаных ордэнамі і медалямі за вялікія заслугі ў падрыхтоўцы спецыялістаў і развіцці навукі. У першым радзе (злева направа): Гаўрыла Аляксеевіч ПАВЕЦЬЕЎ, Іван Мікалаевіч ЛУШЧЫЦКІ, Ілья Рыгоравіч НЕКРАШЭВІЧ, Барыс Іванавіч СЦЯПАНАЎ. Стаяць: Уладзімір Рыгоравіч ІВАШЫН, Лаўрэнцій Сямёнавіч АБЕЦАДАРСКІ, Рыгор Васільевіч БУЛАЦКІ.

Фота Л. КУЗЬМІЦКАГА.

## На завочным факультэце

Значным быў сёлетні набор на аддзяленні завочнага факультэта. У гэтым годзе жадаючых вучыцца без адрыву ад вытворчасці было толькі на першым патоку 924 чалавекі. Многія хацелі працягваць вучобу па спецыяльнасці.

Але не ўсе добра падрыхтаваліся да ўступных экзаменаў. Залічана на аддзяленні гісторыі, філасофіі, журналістыкі, біялогіі, геаграфіі, матэматыкі 547 чалавек. У першую чаргу прыняты людзі, якія працуюць на вытворчасці і жадаюць павысіць сваю кваліфікацыю. Сярод прынятых калгаснікі, рабочыя, настаўнікі, юрысты, журналісты...

Але прыём на завочны факультэт універсітэта яшчэ не скончаны. Другі паток пачаў здаваць уступныя экзамены з 1 кастрычніка. Вось што сказаў нашаму карэспандэнту дэкан завочнага факультэта Уладзімір Рыгоравіч Івашын:

— Зараз уступныя экзамены будуць здаваць людзі, занятыя ў асноўным сезоннымі работамі і тыя, хто па той ці іншай прычыне не змог здаваць экзамены ў чэрвені.

Прыём цяпер ідзе на аддзяленні журналістыкі і юрыдычнае.

# Па універсітэту

## З глыбіні вякоў

*Летам студэнты гістарычнага факультэта выязджалі на практыку ў розныя месцы краіны. Дзякуючы іх раскопкам гістарычны музей нашага універсітэта папоўніўся новымі каштоўнымі экспанатамі.*

*Асаблівую цікавасць прыцягваюць да сябе экспанаты з Херсанеса-Таўрычнага. Большасць з іх належыць да VI—III вякоў да нашай эры. Гордасцю студэнтаў групы, якая вяла тут раскопкі, з'яўляецца вялізны піфас, які мае ў дыяметры 1,5 метра. У старажытныя часы ён прызначаўся да захавання зерня, віна, рыбы, мёду і іншых прадуктаў. Не меншую цікаўнасць прадстаўляе мармуровая кіпіцель (верхняе ўпрыгожванне калоны) і аснова яе, якія належаць да элінічнага перыяду.*

*Сярод іншых экспанатаў вызначаюцца фрагменты чорналакавай керамікі бітага посуду з маляўнічымі ўзорамі, гарлавіны херсанескіх збанаў, фрагменты вадазліўных труб, свяцільнікі, грузілы для лоўлі рыбы.*

*На раскопках у Керчы знойдзены прыблізна такія ж экспанаты. Неўзабаве яны прыбудуць у музей.*

*Студэнты, якія вялі раскопкі ў мястэчку Юдзінава Бранскай вобласці, прывезлі ў музей косці маманта і іншых жывёлін эпохі палеаліта.*

*Хутка студэнты змогуць азнаёміцца з гэтымі экспанатамі на выстаўцы, якая адкрыецца ў гуманітарным корпусе.*

Г. ПРАВАЛОВІЧ.

## Да таямніц атама

У лютым гэтага года на фізічным факультэце адкрылася кафедра ядзернай фізікі. Яна праводзіць навукова-даследчыя работы па выкарыстанню ядзернай энергіі ў мірных мэтах. Для праходжання практыкі студэнтамі адкрылася лабараторыі. Студэнтам чытаюцца спецыяльныя курсы па розных аддзелах ядзернай фізікі і тэхнікі. Ужо праведзен практыкум са студэнтамі 3-га курса.

З пераходам у новы вучэбны корпус будуць разгорнуты ўсе маркуемыя лабараторыі. Акрамя вучэбнай работы кафедра пачне весці навукова-даследчыя работы з выкарыстоўваннем іх па прамысловасці.

А. Н. ПІСАРЭЎСКІ,

загадчык кафедры ядзернай фізікі і прымянення атамнай энергіі ў мірных мэтах.

Пісьмо з цаліны

## „Прыязджайце да нас!“

**Нядаўна на імя сакратара парткома Р. В. Булацкага прыйшло пісьмо ад выпускніцы універсітэта мінулага года Раісы Нябоська, якая працуе зараз настаўніцай у Нова-Уладзіміраўскай школе-інтэрнаце Вішнёўскага раёна Цалінаградскай вобласці.**

*Вось што піша Раіса Нябоська. «Я пішу вам, ужо знаходзячыся ў Нова-Уладзіміраўскай школе-інтэрнаце. Саўгас наш знаходзіцца у трох кіламетрах ад станцыі, шасцідзесяці кіламетрах — ад раённага цэнтра і ў сямідзесяці кіламетрах ад Цалінаграда. Інтэрнат толькі ў гэтым годзе адкрыўся на базе агульнаадукацыйнай школы. Так, ёсць цяжкасці: займаемся ў дзве змены, тут жа жывуць і вучні. Няма ў нас многіх падручнікаў, метадычнай літаратуры, наглядных дапаможнікаў. Але мы не адступаем перад цяжкасцямі.*

*Працую я завучам і вяду рускую мову ў восьмым класе. У школе няма настаўнікаў гісторыі, геаграфіі, спеваў, фізкультуры, працы.*

*Няхай нашы выпускнікі смела едуць сюды працаваць. Справа ўсім знойдзецца. Тут вельмі патрэбны людзі. Прынялі нас у саўгасе добра. У калектыве школы людзі самых розных нацыянальнасцей: рускія, украінцы, беларусы, мардоўцы, немцы, казахі, татары. Са мной жывуць дзяўчаты — выпускніцы педагагічнага інстытута з Украінскай ССР.*

*Да кожнага урока прыходзіцца добра рыхтавацца: мы тут — прыклад для ўсіх. Да нашага прыезду тут не было спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Да нас ідуць з усімі пытаннямі: і насценгазету саўгасную дапамагчы выпусціць, і «баявыя лісткі», і гурткі самадзейнасці арганізаваць з моладдзю. Тут вельмі, вельмі патрэбны настаўнікі.*

*Я ўдзячна універсітэту за тыя веды, якія атрымала ў час вучобы. Мне вельмі спатрэбіліся яны цяпер.*

*Але ведаеце, як зараз прыходзіцца шукаць літаратуру і чытаць? Здаецца, калі б зараз прыехала ў Мінск, па цэлых днях не выходзіла б з бібліятэкі»...*

## ЗЛАДЖАНА СТРУНЫ ЗВІНЯЦЬ...

Стварыць аркестр народных інструментаў на філалагічным факультэце рашылі яшчэ ў мінулым годзе. Вывесілі аб'яву, а праз некаторы час пачаліся першыя рэпетыцыі. Многіх удзельнікаў хвалявала пытанне: ці атрымаецца, ці зможам сапраўды па-мастацку выконваць музычныя творы?

Мінулі дні, самадзейныя аркестранты ўпарта шліфавалі сваё майстэрства, дабіваючыся зладжанасці гучання.

І вось надыйшоў дзень першага канцэрта. Бадай, не менш за кіраўніка аркестра, студэнта трэцяга курса Анатоля Дзямідзенкі, хваляваліся А. Нічыпарук, першая прыма, і кантрабасіст М. Шаруба, якога ў жарт называюць «каралём аркестра». Ад іх майстэрства ў значнай меры залежыць, што прыдзе з першым выступленнем: поспех або няўдача.

Упэўнены, лёгкі, ледзь прыкметны знак дырыжора — і магутна, шырока ільецца мелодыя. Гукі то нарастаюць, то заміраюць, быццам коцяцца магутныя дняпроўскія хвалі. За украінскай народнай песняй «Раве тай стогне Дніпр шырокій» чуюцца рускія, польскія мелодыі.

Камісія па агляду мастацкай самадзейнасці прысудзіла калектыву першае месца сярод аркестраў універсітэта.

Аркестранты-філолагі выступалі перад шахцёрамі Салігорска, студэнтамі і выкладчыкамі педагагічнага інстытута імя Горкага.

У гэтым навучальным годзе аркестр папоўніўся новымі ўдзельнікамі з ліку студэнтаў-першакурснікаў. Рэгулярна, кожны тыдзень праходзяць рэпетыцыі. Гэта з'яўляецца гарантыяй новых поспехаў аркестра.

Б. НІКОЛЬСКІ.



Такія аўдыторыі будуць у новым корпусе універсітэта.

МАТЭРЫЯЛЫ З КАЛГАСА ІМЯ ФАЛЬКО ДЗЯРЖЫНСКАГА РАЁНА ЧЫТАЙЦЕ НА 2-ой СТАР.

*Студэнты—журналісты на калгасных палях*

# ПРЫКЛАД ПАКАЗВАЮЦЬ КАМУНІСТЫ

*ВАМ ЛЕПШЫХ? — перапытаў брыгадзір чацвёртай брыгады Барыс Васільевіч Маліноўскі і, крыху падумаўшы, дадаў: — Анцыфераў, Кукевіч, Панёў, Капусцін, Говін, Сачанка, Якубовіч, Жвалеўскі...*

*Характэрная дэталь: усе, з каго брыгадзір пачаў гэты пералік — камуністы. Нічым знешне не вызяляюцца яны сярод сваіх сяброў. Студэнты як студэнты: вясёлыя, жыццерадасныя, і нічога гераічнага зрабіць яшчэ не паспелі. І ўсё ж нездарма брыгадзір першымі сярод лепшых назваў імёны камуністаў.*

*Звычайна мы пачынаем гаварыць аб чалавеку, калі ён зробіць што-небудзь незвычайнае, стане героем дня, рэдка заўважаем яго ў паўсядзённым жыцці. А менавіта тут і праяўляецца чалавек, выяўляюцца яго маральныя і валявыя якасці, яго чалавечая годнасць. Вось нам і хочацца расказаць аб гэтым зусім звычайным, паўсядзённым, здавалася б, на першы погляд, нязначным.*

*...Час ужо набліжаўся да поўдня. Віталій Анцыфераў, Андрэй Кукевіч, Уладзімір Панёў прыбралі свае рабочыя месцы і нецярпліва пазлядалі на стрэлкі сваіх гадзіннікаў. Хтосьці ўжо скамандаваў:*

*— Гайда абедаць!*

*У гэты час да кароўніка, на будаўніцтве якога хлопцы выконвалі падсобныя работы, пад'ехаў грузавік. У кузаве дыміўся разагрэты асфальт. Кабіна адчынілася і паказаўся старшыня арцелі Васіль Васільевіч Шайкоўскі. Ен падыйшоў да хлопцаў, прывітаўся.*

*— Атрымалася не зусім добра. Абед якраз, а асфальту застываць нельга...*

*Хлопцы пераглянуліся.*

*— Дык мы яшчэ не збіраемся на абед,—схітраваў Андрэй. — А ну, добраахвотнікі, хто за мной?*

*Закіпела дружная праца. І хоць хлопцы спазніліся на абед, затое праход у новым жывёлагадоўчым памяшканні быў заасфальтаваны.*

*Васіль Васільевіч моцна паціснуў рукі хлопцам і шчыра прызнаўся:*

*— Не думаў, што вы такія.*

*...Не вельмі часта здараецца чуць, каб пажылы чалавек называў зусім маладога хлопца па бацьку. А вось Сачанку так і называюць: Іван Іванавіч.*



Іван Сачанка і Фелікс Ксензенка робяць яшчэ адзін бурт бульбы.



Ці добра ачышчана зерне? Валянцін Жвалеўскі рашыў праверыць гэта яшчэ раз.



Аркадзь Бяспалы і Адам Капусцін прыселі падмацавацца.

*І не абы хто, а сам брыгадзір. Вы скажаце, што гэта жарт. Памыляецеся. Зусім не жарт. Іван разам са Сцяпанам Говіным і Феліксам Ксензенкам працуе на буртоўцы бульбы. Ен ужо заканчвае шосты бурт. І робіць гэта так умела, што нават вопытныя калгаснікі дзіву даюцца. Бурты атрымліваюцца роўныя, правільнай формы. А прычына тут вельмі простая: ні Сачанка, ні Говін, ні Ксензенка не адносяцца абыякава да справы. Другому што — высыпаў бульбу з воза і справе канец. У іх жа не так. Кожную недакладнасць яны адразу ж выпраўляюць. І нездарма брыгадзір называе іх «майстрамі буртоўкі». Больш 120 тон бульбы забуртавалі за гэты час хлопцы.*

*...Усе ўжо стаміліся. І не дзіва. Каторы час носяць яны мяшкі з зернем ад камбайна. Машына працуе ў поўную моц, толькі паспявай! А некаторыя пачынаюць ужо здаваць.*

*Раптам чуецца голас:*

*— Хлопцы! Ну, яшчэ крышку! Зерне ж псуецца — гарыць у бурце. Ды і машына працуе ўхаластую.*

*Не, не брыгадзіру належалі гэтыя словы. Іх сказаў Адам Капусцін. І словы гэтыя знайшлі гарачы водгук у сяброў. Яны не засталіся абыякавымі да прапановы камуніста: праца працягвалася поўным ходам да перапынку. Справіліся хлопцы і са стомай, і з работай.*

*Хочацца асобна сказаць пра Капусціна. Калі характарызуюць працавітага чалавека, гавораць, што ў працы ён ператвараецца. Гаворачы аб Капусціне, нельга не паўтарыць гэтыя словы яшчэ раз. Заўсёды спакойны, сканцэнтраваны, ён, здаецца, ніколі не ведаў стомы.*

*Гэты выпадак гаворыць і яшчэ аб адным: вялікая справа—асабісты прыклад.*

*Расказаныя вышэй факты — гэта далёка не поўная характарыстыка працоўных спраў нашых сяброў. Іх працоўныя справы сведчаць аб тым, што ў нашай універсітэцкай сям'і выхоўваецца сапраўдны чалавек новага камуністычнага грамадства. І ўперадзе, як заўсёды, ідуць ідуць камуністы.*

**А. НІЧЫПАРУК,**
**Л. КУЗЬМІЦКІ,**
**спец. кар. «Беларускага універсітэта».**

# Не адстаюць ад калгаснікаў

ЯШЧЭ ДА ПРЫЕЗДУ студэнтаў я меркаваў паставіць іх на розныя падсобныя работы. Мне здавалася, што прыедуць у брыгаду юнакі і дзяўчаты, якія мала знаёмы з сельскагаспадарчымі работамі, нязвыклыя да фізічнай працы. Але я памыліўся. Да мяне ў брыгаду прыйшлі 14 чалавек другога, трэцяга і чацвёртага курсаў аддзялення журналістыкі, работнікі ўсе, як на падбор.

Раскажу больш падрабязна аб рабоце некаторых са студэнтаў. На самыя неадкладныя і сур'ёзныя работы я пасылаў студэнта другога курса Аркадзія Бяспалага. Так, калі трэба было перанесці ў свіран абмалочанае зерне грэчкі, ён перанёс каля сотні мяшкоў зерня, што складае, прыкладна, 5 тон. Або ўзяць другі выпадак. На сушцы ільносемя ён прапусціў праз агрэгат каля 3 тон зерня. Аркадзь быў на самых разнастайных работах. Працуючы на сяўбе, ён за кароткі тэрмін засеяў 11 гектараў збожжа. Увогуле, на якой бы рабоце ні працаваў камсамолец Аркадзій Бяспалы, усюды ён паказваў узор сумлення і старання.

Добрымі працаўнікамі паказалі сябе і сябры А. Бяспалага, Аляксандр Шлег, Міхаіл Казакевіч, Вадзім Грынкевіч і іншыя.

Хочацца расказаць аб выпадку, які мяне вельмі крануў. Выпадак гэты здарыўся сярод дзяўчат. Студэнткі Марыя Лазоўская, Алена Трукшына, Джэма Шохан і другія працавалі на копцы бульбы. Штодзённа яны ўбіралі па пяць сотак бульбы.

І вось аднойчы дзяўчаты мне сказалі, что Марыя Лазоўская выйшла на працу хворая. У дзяўчыны была тэмпература і адчувала яна сябе не зусім добра. Сяброўкі раілі ёй адляжацца, бо з хваробай жарты дрэнныя. Але Марыя іх не паслухала.

— Дзяўчаты працуюць, а я буду ляжаць?..

Да Марыі накіравалася цэлая дэлегацыя. Я з радасцю ўбачыў, як па сяброўску аднесліся да Марыі студэнты, акружылі яе клопатамі і ўвагай.

Нельга не расказаць і яшчэ аб адным. Пасля працоўнага дня Валянцін Жвалеўскі, Фелікс Ксензенка і іх таварышы вярталіся дамоў. Хлопцы стаміліся за дзень. Але раптам на небасхіле пачалі згушчацца хмары. Набліжаўся дождж.

— Лён яшчэ не ўвесь падабраны, — звярнуўся я да хлопцаў, — Патрэбна дапамога.

І хлопцы, ўсе, як адзін, ізноў пайшлі на поле. У гэты ж дзень Валянцін Жвалеўскі адзін перавёз 10 вазоў саломкі, пагружаў і разгружаў яе. Ен працаваў, не ведаючы стомы.

Прайшоў працоўны тыдзень. Наступіла нядзеля. Надвор'е было добрае, і студэнты рашылі правесці ў гэты дзень нядзельнік.

— На полі шмат бульбы, — гаварылі яны. — Калі мы папрацуем гэты дзень, дык колькі лішніх гектараў убяром.

У нашай сельгасарцелі узводзіцца прыгожы новы клуб.

— Хто жадае працаваць на будаўніцтве клуба?—спытаў я ў сваіх новых памочнікаў.

—Я, — сказаў Віталій Анцыфераў.

—І я,—сказаў Аляксандр Шлег.

Вызваліся і іншыя. Хлопцы паспяхова працавалі на будаўніцтве клуба.

На буртоўцы бульбы, на ачыстцы насення, на сяўбе, на сіласаванні кармоў, на копцы бульбы—усюды студэнты працавалі хутка і добраякасна, не адстаючы ад калгаснікаў.

Мы з вялікім задавальненнем кажам ім:

— Вялікае дзякуй!

**БАРЫС МАЛІНОЎСКІ,**
**брыгадзір чацвёртай паляводчай брыгады калгаса імя Фалько Дзяржынскага раёна.**



## Мы—будаўнікі!

*А гэта хімікі, якія працуюць на будаўніцтве свінафермы ў калгасе імя Сталіна Дзяржынскага раёна. І хоць Міхаіл Сомаў, Віктар Капуцкі, Сяргей Ткачоў выконваюць падсобныя работы—рыхтуюць раствор для залівкі падлогі, падносяць матэрыялы—яны не без гонару зазначаюць:*

*— Мы будаўнікі!*

*НА ЗДЫМКУ: Міхаіл Сомаў і Віктар Капуцкі рыхтуюць раствор.*

# Г. С. ЛАКІЗА



26 верасня 1961 года пасля цяжкай хваробы заўчасна памерла старшая выкладчыца кафедры гісторыі філасофіі, логікі і эстэтыкі, кандыдат філасофскіх навук Ганна Савішна Лакіза. Сваё кароткае, але багатае і змястоўнае жыццё Ганна Савішна пражыла, як сапраўдны савецкі чалавек.

Яна нарадзілася ў 1917 годзе ў горадзе Глухаве Сумской вобласці ў сям'і рабочага.

У 1935 годзе, пасля пераезду сям'і ў Бабруйск, яна скончыла медыцынскую школу. У гады вайны Ганна Савішна была эвакуіравана ў Свярдлоўскую вобласць, дзе працавала простай медыцынскай сястрой у адным з воінскіх шпіталяў.

Цяга да ведаў абумовіла яе жыццёвы шлях.

У 1947 годзе Ганна Савішна паспяхова скончыла МГУ імя Ламаносава, пасля чаго працавала выкладчыцай літаратуры.

Ва універсітэце яна пачала працаваць у 1952 годзе, а праз год Г. С. Лакіза абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Значэнне марксісцка-ленінскай філасофіі для эстэтыкі». Акрамя таго яна надрукавала ў часопісах і газетах артыкулы «Да пытання аб адносінах філасофіі да эстэтыкі, «Ленін аб мастацтве», «Якуб Колас аб паэце і паэзіі», «Мастацтва як сродак эстэтычнага выхавання» і іншыя работы.

У апошнія гады Г. С. Лакіза працавала над брашурай «Некаторыя пытанні эстэтыкі ў працах Ул. І Леніна» і над зборнікам «Выбраныя творы беларускіх мысліўцаў XIX века».

Мы з глыбокай жалобай і смуткам зазначаем, што ў нашых радах не стала выдатнага таварыша, добрай выкладчыцы, нястомнага прапагандыста ідэй марксісцка-ленінскай эстэтыкі. Універсітэт панёс вялікую страту.

**Група выкладчыкаў кафедры гісторыі, логікі і эстэтыкі.**

Рэктарат, партком, мясцком і кафедра гісторыі філасофіі і логікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай смерці старшага выкладчыка, кандыдата філасофскіх навук Лакіза Ганны Савішны і выказваюць спачуванне сям'і памёршай.

# Меры прыняты

У фельетоне «Шукальнікі ісціны», змешчаным у нашай газеце (№ 25), расказвалася аб хуліганскім учынку групы студэнтаў фізічнага факультэта.

Рэктарат разгледзеў гэта пытанне. Студэнты Сагайдак, Луцыба, Бычкоўскі, Івахнік і Худзякоў выключаны з універсітэта. Астатнія выселены з інтэрната.

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

НАШ АДРАС:
Мінск,
Універсітэцкі гарадок,
біякорпус, 31.
Тэлефон: 2-07-19
Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР.

АТ 06640. Зак. 1991.